*Сцяпан Говін*
Беларускі дзяржаўны універсітэт

Ля вытокаў беларускага маладзёжнага друку.
Алаіза Пашкевіч (Цётка) – рэдактар і публіцыст часопіса «Лучынка»

Беларускі маладзёжны друк пачаў развівацца ў 80-ыя гг. XIX ст., калі студэнты-беларусы, якія вучыліся ў ВНУ Санкт-Пецярбурга, ад імя народніцкай суполкі «Беларуская грамада» выдалі некалькі зваротаў, у т.л. «К белорусской молодежи» і два нумары гектаграфіраванага часопіса «Гомон». Адной з галоўных задач перад сабою ў выдавецкай дзейнасці яны паставілі падняцца маральна-разумовага і эканамічнага быту народа. У сілу многіх прычын народніцкі рух як у Расіі, так і ў Беларусі не стаў масавым, а яго праграмныя мэты так і засталіся невыкананымі. Больш таго, з рэвалюцыйнага рух усё больш і больш станавіўся ліберальным, а радыкальная перыёдыка так і не стала ўсеахватнай. Спатрэбіліся новыя дзесяцігоддзі, каб на пачатку XX ст. беларускі дэмакратычны рух зноў актывізаваўся, а маладыя беларускія адраджэнцы заняліся выдавецкай працай. Так, у 1912—1913 гг. быў наладжаны выпуск літаратурна-навуковага альманаха «Маладая Беларусь», часопіса «Раніца» (1914 г.). Эдуардам Будзька быў падрыхтаваны да выдання на беларускай мове лацінкай часопіс «Siabra» (1915 г.). Часопіс, не дазволены да выхаду, не пабачыў свет.

Менавіта агеньчыкам, які стаў асвятляць дарогу маладым беларусам, стаў часопіс «Лучынка». Першы нумар яго выйшаў у лютым 1914 г. (выдадзена 6 нумароў). Выдаваўся часопіс ў Мінску як літаратурна-мастацкі і навуковы штомесячнік пад рэдакцыяй Аляксандра Уласава. Заняты падрыхтоўкай сельскагаспадарчага часопіса «Саха» (1912—1915 гг.), ён не мог шмат увагі ўдзяляць «Лучынцы», таму фактычным рэдактарам яе стала Цётка, якая дзеля працы над часопісам пераехала ў Мінск. З 3-га нумара яна афіцыйна вяла ў часопісе аддзел белетрыстыкі. Цётка, як ніхто іншы, адпавядала пасадзе кіраўніка «Лучынкі». Яна ўжо была вядомым дзеячам беларускай культуры,

пісьменніцай, журналісткай, рэдактарам, набыўшы выдавецкі вопыт у час працы ў газеце «Наша доля» і замацаваўшы яго ў «Нашай ніве».

Менавіта ў «Нашай долі» ў вершы «Наш падлетак», у іншых мастацкіх і публіцыстычных творах яна заклікала беларускую моладзь араць і засяваць родную зямлю, на якой пакуль што растуць толькі камяні ды палын, брацца за любую працу ў справе духоўнага і культурнага развіцця беларускага народа, павышэння яго нацыянальнай самасвядомасці.

У «Лучынцы» Цётка бачыла своеасаблівую энцыклапедыю беларускага жыцця, таму на яе старонках друкаваліся матэрыялы на эканамічныя, палітычныя тэмы, навуковыя, гістарычныя, краязнаўчыя, этнаграфічныя артыкулы, падарожныя нарысы і нататкі, якія беларускай моладзі давалі магчымасць пазнаваць жыццё беларускага і іншых народаў ва ўсіх яго праявах. Вершы, апавяданні, абразкі, артыкулы і ўспаміны аб вядомых людзях знаёмілі маладых чытачоў з узорамі мастацкай літаратуры, гісторыяй роднага краю, а гэта спрыяла выхаванню ў моладзі пачуцця гонару за сваю радзіму-Беларусь. Усё гэта прыбліжала да агульнасці, дазваляўшай беларусам складвацца ў нацыю.

Усё, што рабіла Цётка ў «Лучынцы», выконвалася з задавальненнем і вялікім натхненнем. Муж Алаізы Сцяпанаўны Стэпонас Кайрыс пазней успамінаў, што ў свае творы, у выданне часопіса яна ўкладвала ўсю сваю душу, няважна, былі гэта верш ці апавяданне, публіцыстычны, навуковы артыкул ці падарожныя нататкі. Усё сваё ўменне яна ўкладвала і ў выпуск кожнага нумара «Лучынкі». (Гл.: Стэпонас Кайрыс. З маіх успамінаў пра Цётку // На суд гісторыі. Успаміны. Дыялогі. – Мн., 1994. – с. 19).

Пра часопіс Цётка клапацілася як пра роднае дзіця. У лісце да Браніслава Эпімаха-Шыпілы (1914, 18 лютага) яна пісала: «... «Лучынку» запалілі, але покі што вельмі слаба яна тлее. Трэба больш агню ад маладых сіл. Дровы, з каторых цяпер шчапаецца «Лучынка», залішне слязьмі – доляй нацягнула, дык слаба гараць. Першы нумар выйшаў без аблічча ад незалежных ад нас прычын... Дзядзечка, клікніце кліч між беларускай маладзёжы, хай бярэцца да працы для

пакіненых братоў і сёстраў у вёсцы». (Цыт. па: Цётка. Выбраныя творы. – Мн., 2001. – с. 216—217).

Адным з накірункаў у дзейнасці Цёткі як рэдактара быў пастаянны пошук аўтараў «Лучынкі»: і карэспандэнтаў ўжо добра вядомых чытачам, і пачаткоўцаў. Напрыклад, у лісце да Браніслава Тарашкевіча (1914 г.) яна прапанавала нават тэмы для распрацоўкі ў артыкулах – беларуская мова (а не «наречие». – С. Г.), балоты, асушэнне, гатункі лясных дрэў, месяц, сонечнае зацьменне, пяскі, эміграцыя, нацыяналізацыя зямлі і інш. З часопісам ахвотна супрацоўнічалі Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, Ц. Гартны, К. Буйло, Ядвігін Ш., У. Галубок, В. Ластоўскі, Б. Тарашкевіч, А. Смоліч, А. Уласаў, А. Паўловіч, Я. Журба, М. Арол, А. Жыгалка, Л. Гмырак, У. Рышкевіч, А. Петрашкевіч, В. Лявіцкая, А. Балкоўскі. Цётка прыцягвала да ўдзелу ў «Лучынцы» ўсё новых і новых аўтараў. Іх удзел у часопісе дазваляў рабіць яго цікавым і змястоўным. З першага нумара Цётка заклікала моладзь паднімацца з калень, каб мэтай жыцця іх зрабілася не марнае існаванне, а змаганне за лепшую долю, каб штодзённай працай класці «падваліны пад яснейшую будучыню». У аднайменным вершы-звароце, надрукаваным у 1-м нумары «Лучынкі», яна заклікала:

Пойдзем да іх мы з «Лучынкай», пасвецім,
Аб роднай старонцы сцікавіма іх, –
Можа, з «Лучынкай» іскры разнецім
Ў думках і ў сэрцах сіл маладых.
І мо з «Лучынкі» іскры гарачы
Асвецяць цёмны хлопцаў куток
І распраменяць вочы дзяўчасці, –
Ахвотней сядзе прасці лянок.
Паволі, ціха ў роўнай меры
Будзем з «Лучынкай» наперад спяшаць –
З вёскі ў вёску, праз кожныя дзверы
Клікаць, каб моладзь святло выйшла ўзяць.

Мастацкія і публіцыстычныя творы Цёткі ў часопісе, – «Да вясковай моладзі беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Аб душы маладзёжы», «Да дзяўчынак», «Да школьнай моладзі», «Папараць-кветка» і іншыя – сталі, па вызначэнні Алега Лойкі, яе лебядзінай песняй, духоўным тэстаментам, класічнымі асновамі нацыянальнай публіцыстыкі. (Гл.: А. А. Лойка. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. У 2-х чч. Ч. 2. – Мн., 1989. – С. 86—88).

«Лучынка», якую запаліла Цётка і якую яна ўмела і цвёрда трымала ў руках, не пагасла. Яе трапяткае святло запаліла новыя «агеньчыкі» беларускай маладзёжнай перыёдыкі, якія асвяцілі шлях беларусам і вывялі іх на дарогу незалежнасці і годнага жыцця сярод іншых народаў.